*Ю. А. ПЕРАВЕРЗЕВА*

# БІБЛІЯТЭКІ І САЦЫЯЛЬНАЕ ПАРТНЁРСТВА

*Разглядаюцца тэарэтычныя аспекты сацыяльнага супрацоўніцтва бібліятэк, яго мэты і задачы, прааналізаваны традыцыйныя, навацыйныя і арганізацыйныя формы сацыяльнага партнёрства бібліятэчных устаноў. Вызначаны асаблівасці арганізацыі сацыяльнага партнёрства на сучасным этапе, а таксама прааналізаваны асноўныя кірункі супрацоўніцтва, шляхі інтэнсіфікацыі сацыяльнага партнёрства бібліятэк з іншымі інстытутамі грамадства.*

Наш час характарызуецца пераменай сацыякультурных нормаў зносін, узнікненнем новых мадэляў і формаў узаемадзеяння бібліятэк са знешнім і ўнутраным асяроддзем, усталяваннем дыялога паміж бібліятэкамі, грамадскасцю і ўладамі. Сацыяльнае партнёрства з’явілася новым тыпам узаемадзеяння бібліятэк з іншымі суб’ектамі грамадскасці, што патрабуе канцэптуальнага перагляду сацыяльнай ролі бібліятэк з улікам эканамічных фактараў і культурна-інфармацыйнага асяроддзя.

Пытанні сацыяльнага партнёрства актыўна распрацоўваюцца ў расійскім бібліятэказнаўстве. Удакладняюцца сутнасць і прызначэнне сацыяльнага партнёрства [5; 7], яго формы [10] і праблемы развіцця [14]. Найбольш грунтоўна адлюстраваны практычныя аспекты ўзаемадзеяння бібліятэк з рознымі інстытутамі грамадства [11; 15]. Дасканала распрацаваны прававыя інструменты развіцця сацыяльнага партнёрства бібліятэчных устаноў як на знешнім, так і на ўнутраным узроўні [6]. Айчыннымі даследчыкамі вышэйназваныя пытанні амаль не закранаюцца, за выключэннем аналізу практычнай дзейнасці рэгіянальных бібліятэк у кантэксце сацыяльнага партнёрства [1]. У дадзеным артыкуле мы спрабуем вызначыць прыярытэтныя напрамкі сацыяльнага партнёрства беларускіх бібліятэк, вылучыць яго формы і этапы станаўлення.

Тэрмін “сацыяльнае партнёрства” даволі актыўна выкарыстоўваецца ў прафесійнай лексіцы, але дакладнага вызначэння паняцця пакуль што не існуе. Згодна І. Осіпавай, сацыяльнае партнёрства можа быць вызначана як “сумесная дзейнасць любых членаў соцыуму (індывідуальных ці калектыўных), накіраваная на вырашэнне пэўнай праблемы, якая ўяўляе для іх узаемны інтарэс” [10, с. 7]. Праблема вырашаецца праз кааперацыю, каардынацыю, інтэграцыю рэсурсаў і намаганняў зацікаўленых партнёраў з улікам папярэдне вызначаных і юрыдычна аформленых умоў. Пры гэтым мэтай сацыяльнага партнёрства лічыцца паляпшэнне пэўных праблем грамадскай сферы пры мінімальных выдатках рэсурсаў. На думку С. Белякова і У. Бубнова, сэнс сацыяльнага партнёрства заключаецца ва ўзаемадзеянні паміж дзяржаўнымі, камерцыйнымі і некамерцыйнымі арганізацыямі [5; 7]. Узаемадзеянне бакоў можа быць дасягнута праз відавочнасць сацыяльнай праблемы, зацікаўленасць партнёраў, прававое абгрунтаванне партнёрства, наяўнасць інфармацыйных рэсурсаў і супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі, распрацоўку праекта як аб’екта для супрацоўніцтва. Пры гэтым важнае значэнне маюць стабільнасць працэсу сацыяльнага партнёрства, выкарыстанне інавацыйных метадаў і падыходаў да вырашэння сацыяльных праблем.

Сацыяльнае партнёрства фарміруецца вакол сацыяльнай праблемы ад моманту яе ўзнікнення і да часу асэнсавання. Маючы вопыт работы з насельніцтвам і інфармацыяй, бібліятэкі разглядаюцца як суб’екты партнёрскіх адносін з пункту гледжання наяўнасці рэсурсаў і сродкаў, у тым ліку дакументных і электронных, а таксама цэнтры аб’яднання шырокіх колаў грамадскасці. У гэтым сэнсе бібліятэкі могуць вырашаць наступныя задачы:

– аказваць інфармацыйную падтрымку дзяржаўным і недзяржаўным арганізацыям і ўстановам;

– актывізаваць інфармацыйна-асветніцкую работу з насельніцтвам;

– арганізоўваць прэзентацыі, семінары, трэнінгі па актуальных пытаннях развіцця грамадства;

– распрацоўваць сумесныя праекты з установамі сацыякультурнай сферы, комплексныя праграмы сацыяльнага партнёрства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– рэалізоўваць адукацыйную функцыю і фарміраваць пачуцці патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці;

– наладжваць супрацоўніцтва бібліятэк розных сістэм і ведамстваў, рэгіёнаў, краін у вырашэнні праблем сацыяльнай накіраванасці;

– здзяйсняць рэгіёназнаўчы падыход да фарміравання сістэмы сацыяльнага партнёрства.

Істотнай уласцівасцю сацыяльнага партнёрства выступае кансалідацыя [8], якая найбольш выразна праявілася ў перыяд 1990-х гг., калі бібліятэкі ўласнымі сіламі і сродкамі пачалі пошук крыніц дадатковага фінансавання. У гэтым сэнсе выкарыстанне механізмаў сацыяльнага партнёрства дае магчымасць пашырэння кола партнёрскіх арганізацый і канкрэтызацыі мэт, формаў і вынікаў супрацоўніцтва.

Сярод формаў сацыяльнага супрацоўніцтва бібліятэк вылучаюцца традыцыйныя, навацыйныя і арганізацыйныя. Традыцыйныя формы сканцэнтраваны вакол сацыяльнага партнёрства бібліятэкара і чытача, бібліятэ-кара і бібліятэкара, бібліятэкі і бібліятэкі [10]. Трэба адзначыць, што на сучасным этапе характар партнёрскіх адносін бібліятэкара і чытача праяўляецца ў вырашэнні арганізацыйных праблем абслугоўвання, задавальненні чытацкіх запытаў рознага віду і зместу, усталяванні стасункаў і зносін, садзейнічанні адукацыйнай, навуковай, вытворчай, выхаваўчай дзейнасці, дзейнасці ў вольны час, замацаванні прэстыжу бібліятэкі. Сацыяльнае партнёрства бібліятэкараў адбываецца ўнутры калектыву і аб’ядноўвае спецыялістаў пэўнай накіраванасці, напрыклад метадыстаў, каталагізатараў, навукова-даследчых супрацоўнікаў. Такія бібліятэчныя калектывы звычайна распрацоўваюць стратэгічныя дакументы тыпу канцэпцый, праграм, якія маюць дзяржаўнае ці рэгіянальнае значэнне. Напрыклад, для распрацоўкі Канцэпцыі развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Бела-русь быў створаны часовы калектыў з прадстаўнікоў буйнейшых бібліятэк краіны і прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Сацыяльнае партнёрства паміж бібліятэкамі характарызуецца неабходнасцю ўзаемадзеяння ва ўмовах укаранення інфармацыйных тэхналогій і пераасэнсавання мэт і задач бібліятэчнага абслугоўвання. Новыя характарыстыкі набылі працэсы міжбібліятэчнага абанементу і міжнароднага кнігаабмену; актыўна выкарыстоўваюцца зводныя электронныя каталогі і электронная дастаўка дакументаў; удасканальваюцца сістэмы даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання; пашыраюцца функцыі і змест навукова-даследчай работы бібліятэчных устаноў, распрацоўваюцца праграмы перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў з улікам сучасных методык выкладання.

Навацыйныя формы сацыяльнага партнёрства характарызуюцца комплекснасцю і мэтамі арганізацыі супрацоўніцтва. На падставе вывучэння і аналізу вопыту публічных бібліятэк нашай краіны [3; 13] і замежных краін [15] мы лічым магчымым вызначэнне наступных навацыйных формаў сацыяльнага партнёрства: удзел бібліятэк у вырашэнні сацыяльных праблем тэрыторый; супрацоўніцтва з органамі ўлады, грамадскімі арганізацыямі, грантадаўцамі; узаемадзеянне з пэўнымі сацыяльнымі групамі карыстальнікаў; распрацоўка канцэпцый і праграм дабрачыннасці; стварэнне пры бібліятэках кансультацыйных цэнтраў у сферы сацыяльна-эканамічнай дзейнасці; выкарыстанне метаду праектаў пры вылучэнні напрамкаў сацыяльнага супрацоўніцтва; распрацоўка мэтавых мерапрыемстваў адукацыйна-навуковага і культурна-адпачынкавага характару; падрыхтоўка і распаўсюджванне метадычнай літаратуры па пытаннях сацыяльнага партнёрства; стварэнне бібліятэчных кансорцыумаў і некамерцыйных структур пры бібліятэках.

Вылучаюцца і арганізацыйныя формы партнёрства. Гэта пратаколы аб намерах, дагаворы, дыялогі, кантракты, пагадненні, бізнес-планы, праграмы, саветы, рабочыя групы. Яны выкарыстоўваюцца для дакументальнага афармлення супрацоўніцтва бібліятэк з іншымі арганізацыямі пры рэалізацыі сумесных праектаў.

Фарміраванне сістэмы сацыяльнага партнёрства – складаны працэс, які залежыць ад шэрага аб’ектыўных і суб’ектыўных абставін: стану і месца бібліятэкі ў соцыуме,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльных умоў, матывацыі і зацікаўленасці партнёраў, магчымасцей калектыву і кіраўніцтва бібліятэкі і інш.

Вывучэнне тэарэтычных крыніц па названай праблеме [5; 8] дазваляе нам сфарміраваць пэўную сістэму сацыяльнага партнёрства бібліятэк, якая, на нашу думку, складаецца з некалькіх этапаў. Першы, аналітычна-адукацыйны, уключае ацэнку патэнцыялу бібліятэкі цалкам і яе структурных адзінак паасобку, выбар і карэкціроўку элементаў сістэмы, падрыхтоўку персаналу, маніторынг. Апошні дазваляе прааналізаваць вынікі і эфектыўнасць работы і прадбачыць перспектыўныя кірункі дзейнасці, а таксама выявіць матывацыю калектыву да супрацоўніцтва.

Другі этап – арганізацыйна-нарматыўны. Галоўная мэта дзейнасці – абгрунтаванне арганізацыйнай пабудовы супрацоўніцтва і падрыхтоўка лакальных нарматыўных актаў. Рэкамендуецца адлюстроўваць кірунак сацыяльнага партнёрства ў такіх унутрыбібліятэчных дакументах, як статут бібліятэкі, палажэнне аб бібліятэцы, палажэнне аб супрацоўніцтве, памятка арганізатару работы па сацыяльным партнёрстве, службовыя інструкцыі, планы работы [9].

Трэці этап – рэалізацыя і кіраванне працэсамі сацыяльнага партнёрства. Тут адбываюцца адпрацоўка механізмаў сацыяльнага партнёрства, удасканаленне гэтай дзейнасці, пашырэнне формаў арганізацыі супрацоўніцтва, складаюцца планы сумесных дзеянняў, абгрунтоўваюцца напрамкі сацыяльных ініцыятыў, прагназіруюцца вынікі і іх эфектыўнасць.

Мы пагаджаемся з думкамі навукоўцаў І. Осіпавай і В. Махаевай адносна неабходнасці вызначэння эфектыўнасці работы бібліятэк у сферы сацыяльнага партнёрства. Яны прапануюць ажыццяўляць ацэнку эфектыўнасці ў выяўленні дынамікі і колькаснага складу чытачоў, павелічэнні партнёрскіх кантактаў і іх разнастайнасці. У якасці індыкатараў эфектыўнасці разглядаюцца ўдзел бібліятэкараў у рабоце саветаў, камісій, распрацоўцы праграм і мерапрыемстваў розных узроўняў [9; 10]. Разам з тым мы лічым неабходным падкрэсліць значнасць наступных паказчыкаў эфектыўнасці сацыяльнага партнёрства: запатрабаванасць бібліятэкі карыстальнікамі (вызначаецца паказчыкамі чытальнасці і наведванняў); запатрабаванасць бібліятэкі партнёрамі (вызначаецца колькасцю партнёраў і сумесных праектаў); наяўнасць пазабюджэтнага фінансавання (вызначаецца ў працэнтных адносінах ад агульнага каштарысу бібліятэкі і відаў пазабюджэтных паступленняў); наяўнасць рэгламентуючай і планавай дакументацыі сацыяльнай накіраванасці.

Асаблівай увагі патрабуе і арганізацыя сістэмы сацыяльнага партнёрства. Яе кампаненты ўплываюць на выбар і распрацоўку напрамкаў супрацоўніцтва. Апошнія маюць тэматычную накіраванасць і падзяляюцца з улікам статусу і формы ўласнасці партнёраў. Праведзенае намі вывучэнне аглядаў дзейнасці публічных бібліятэк рэспублікі за 2004–2006 гг. [2; 4; 12] дазваляе вылучыць наступныя напрамкі сацыяльнага супрацоўніцтва: краязнаўства, прафарыентацыйная работа, патрыятычнае выхаванне, прававая адукацыя насельніцтва, папулярызацыя здаровага ладу жыцця, экалагічнае выхаванне, інфармацыйна-ідэалагічная работа.

Краязнаўчы напрамак сацыяльнага партнёрства мае рэгіёназнаўчы аспект. Традыцыйнымі партнёрамі бібліятэк з'яўляюцца архівы, музеі, суполкі краязнаўцаў, мясцовыя сродкі масавай інфармацыі.

Прафарыентацыйная работа пашырае знешнія межы бібліятэчнай дзейнасці. Вядома супрацоўніцтва бібліятэк з установамі адукацыі, маладзёжнай палітыкі, цэнтрамі занятасці, школамі, каледжамі. Бібліятэкі маюць вопыт арганізацыі дзён інфармавання, дзён спецыяліста, дзён бібліяграфіі, што спрыяе пашырэнню кола карыстальнікаў і распраўсюджванню інфармацыі аб бібліятэцы.

Сацыяльнымі партнёрамі бібліятэк, якія працуюць у сферы патрыятычнага выхавання, з'яўляюцца ваенкаматы, камітэты салдацкіх маці, саветы ветэранаў, органы ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Сумеснымі намаганнямі распрацоўваюцца мэтавыя праграмы адпаведнага зместу, ладзяцца тэматычныя і святочныя мерапрыемствы.

Дзейнасць бібліятэк і аддзелаў адукацыі, камісій па справах непаўналетніх накіравана на папулярызацыю здаровага ладу жыцця. На базе бібліятэк праводзяцца мерапрыемствы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па прафілактыцы курэння, наркаманіі, дэвіянтных паводзін. Выкарыстоўваецца дапамога медыцынскіх работнікаў, святароў Беларускай праваслаўнай царквы.

Папулярнасць набылі публічныя цэнтры прававой інфармацыі, створаныя на базах бібліятэк пры падтрымцы рэгіянальных і гарадскіх цэнтраў прававой інфармацыі, прыватных юрыдычных кансультацый і даведачна-прававых службаў. Публічныя бібліятэкі рэспублікі атрымалі магчымасць карыстацца юрыдычнымі базамі даных Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, ажыццяўляць доступ праз інтэрнет да прававых парталаў.

Даволі актыўнае развіццё набывае дзейнасць бібліятэк у напрамку экалагічнага выхавання. Распрацаваны шэраг комплексных праграм экалагічнага інфармавання і асветы, працуюць клубы экалагічнай адукацыі, агенцтвы аматараў і абаронцаў прыроды. У якасці партнёраў бібліятэк выступаюць мясцовыя органы ўлады, міжнародныя арганізацыі, Міністэрства па ахове навакольнага асяроддзя, лясніцтвы.

Інфармацыйна-ідэалагічная работа бібліятэк ажыццяўляецца сумесна з органамі мясцовай заканадаўчай і выканаўчай улады, кіраўніцтвам прамысловых прадпрыемстваў, ідэалагічнымі актывамі арганізацый і ўстаноў. Выкарыстоўваюцца індывідуальныя і масавыя формы інфармавання, у тым ліку аператыўнае, здзяйсняюцца падбор і сістэматызацыя літаратуры па азначаным напрамку. На базах бібліятэк арганізуюцца дні сельскага кіраўніка, гадзіны палітінфармацыі, тыдні інфармавання для малазабяспечаных сямей і людзей сталага ўзросту.

Арганізацыя сістэмы партнёрскай дзейнасці прадугледжвае пэўную сацыяльную справаздачнасць. Яна патрэбна для высвятлення сацыяльных вынікаў дзейнасці, ажыццяўлення самаацэнкі, замацавання даверу супрацоўнікаў, партнёраў, органаў улады, стварэння асновы стратэгічнага развіцця бібліятэкі. У якасці сацыяльнай справаздачнасці бібліятэчнымі ўстановамі могуць быць выкарыстаны водгукі чытачоў аб ролі бібліятэкі ў адукацыйнай, сацыяльнай адаптацыі, у арганізацыі вольнага часу, водгукі заснавальнікаў аб сацыяльнай значнасці бібліятэк для развіцця пэўных тэрыторый, водгукі калег, ганаровыя граматы, дыпломы і іншыя дакументы, якія пацвярджаюць сацыяльны статус бібліятэк у грамадстве.

Развіццё ўстойлівых кантактаў з партнёрамі дазваляе бібліятэкам узбагаціць сваю работу змястоўна і арганізацыйна. Пры гэтым выкарыстоўваюцца наступныя шляхі інтэнсіфікацыі партнёрскай дзейнасці: удасканаленне кіравання бібліятэкай; арганізацыя праектнай дзейнасці сумесна з дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі, зацікаўленымі ў вырашэнні праблем сацыяльнай накіраванасці; развіццё PR-дзейнасці, пашырэнне функцыі рэкламы і стварэнне іміджу бібліятэкі; узмацненне міжбібліятэчных сувязей у кірунку сацыяльнага партнёрства; каардынацыя дзейнасці бібліятэк і іншых інстытутаў сацыялізацыі асобы.

Такім чынам, сацыяльнае партнёрства ўзбагачае бібліятэчную дзейнасць новымі формамі і напрамкамі, спрыяе замацаванню прэстыжу кнігі і чытання. Сацыяльна арыентаваныя кірункі бібліятэчнай работы з'яўляюцца гарантыяй якаснага бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў і пашыраюць магчымасці супрацоўніцтва бібліятэк з рознымі інстытутамі грамадства, а таксама спрыяюць усталяванню знешніх і ўнутраных сістэмных сувязей у бібліятэках. Комплексны доўгатэрміновы характар сацыяльнага супрацоўніцтва садзейнічае вырашэнню канкрэтных мэт і задач функцыянавання бібліятэк.


1. *Абласныя* бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выд. / адказ. за вып. Л. Г. Кірухіна. – Мн.: Нац. б-ка Беларусі, 2004. – 112 с.

2. *Аналіз* дзейнасці бібліятэк Брэсцкай вобласці за 2006 год / склад. Л. К. Кароль [і інш.]. – Брэст: Абласная бібліятэка імя М. Горкага, 2007. – 17 с.

3. *Бібліятэкі* Гродзеншчыны: аналіз дзейнасці публічных бібліятэк вобласці за 2005 год / склад. Я. А. Гавака [і інш.]. – Гродна: Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага, 2006. – 32 с.

4. *Бібліятэкі* Міншчыны ў 2004 годзе: агляд дзейнасці / склад. В. П. Алешка [і інш.]. – Мн.: Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна, 2005. – 73 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5. Беляков, С. Ю.* Что это такое и с чем его едят? Национальные особенности социального партнёрства / С. Ю. Беляков // Библиотечное дело. – 2004. – № 1 (13). – С.4–6.

*6. Бойкова, О.* Законодательные основы договорных отношений библиотек в процессе социального партнёрства / О.Бойкова // Библиотечное дело – XXI век: науч.- практ. сб. – 2005. – Вып. 2 (10). – С. 25 –37.

*7. Бубнов, В. В.* Современный уровень социального партнёрства региональной библиотеки / В. В. Бубнов // Мир библиографии. – 2004. – № 4. – С. 13 –15.

*8. Куликова, Л. В.* Место публичных библиотек в социальной инфраструктуре: организационные и правовые аспекты / Л. В. Куликова // Информационный бюллетень РБА. – 2003. – № 28. – С. 29–33.

*9. Махаева, В.* Новая форма жизни. Социальное партнёрство как принцип управления библиотекой / В. Махаева // Библиотечное дело. – 2004. – №2 (14). – С.14 –16.

*10. Осипова, И. П.* Социальное партнёрство как один из механизмов реализации библиотечной политики: опыт и проблемы / И. П. Осипова // Библиотечное дело – XXI век: науч.-практ. сб. – 2005. – Вып.2 (10). – С. 6–25.

*11. Петрова, Т. В.* Детская библиотека в контексте социального партнёрства в интересах детей / Т. В. Петрова // Бібліятэка прапануе. – 2004. – № 4. – С. 27 – 30.

*12. Публичные* библиотеки Гомельщины в 2005 году: обзор деятельности / сост. М. С. Рафеева [и др.]. – Гомель: Гомельская областная универсальная библиотека им. В. И. Ленина, 2006. – 40 с.

*13. Публічныя* бібліятэкі Магілёўшчыны: здабыткі 2006 года: аналітычная даведка, статыстычныя паказчыкі работы / склад. Т. Г. Пашкоўская. – Магілёў: Магілёўская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна, 2007. – 19 с.

*14. Слайковская, Н.* В вывеске ли дело? / Н. Слайковская // Библиотека. – 2002. – № 5. – С.42 – 47.

*15. Смолина, Е.* Стратегия консолидации. Библиотеки и социальное партнёрство / Е. Смолина // Библиотечное дело. – 2004. – № 1 (13). – С. 1 –3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ